цыянальную аўтаномію і імунітэт нацыі супраць эканамічнай эксплуатацыі. Беларуская дэлегацыя прадставіла мемарандум, у якім былі сфармуляваны палітычныя патрабаванні беларускага нацыянальнага руху аб утварэнні беларускай дзяржавы. Заканчваўся гэты мемарандум зваротам да еўрапейскіх нацый са спадзяваннем, што яны дапамогуць «забяспечыць Беларусі ўсе яе палітычныя і культурныя правы, што яны дадуць нашаму народу магчымасць вольна развіваць свае разумовыя, маральныя і эканамічныя сілы і гэтыя правы дазволяць нам стаць гаспадарамі на сваёй уласнай зямлі»[12].

У выніку дзейнасці беларускіх прадстаўнікоў на канферэнцыі ў Стакгольме і на кангрэсе нацый у Лазанне народы Еўропы і ўсяго свету ўпершыню пачулі галосную заяву аб тым, што Беларусь жыве і жадае існаваць далей у якасці самастойнай дэмакратычнай дзяржавы. Гэта быў першы выхад Беларусі на міжнародную арэну.

Такім чынам, у пачатку XX ст. пытанне нацыянальнай дзяржаўнасці займае цэнтральнае месца ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі. Падыходы да вырашэння гэтага сапраўды набалелага пытання былі розныя: ад поўнага адмаўлення права Беларусі на будаванне ўласнай дзяржавы (з боку рускага і польскага нацыяналізму) да патрабавання поўнай дзяржаўнай незалежнасці краю («Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі»). Пераважвала ж у грамадска-палітычнай думцы таго часу ідэя нацыянальнай дзяржаўнасці ў форме аўтаноміі ў складзе Расіі.

Тэарэтычныя пошукі і практычныя захады нацыянальных дзеячоў падрыхтавалі ідэйную аснову для практычных мер па стварэнню беларускай дзяржавы, якімі сталі абвяшчэнне БНР у сакавіку 1918 г. і БССР у студзені 1919. Гэтыя пошукі выклікаюць цікавасць і ў цяперашні час, калі прынята Дэкларацыя аб суверэнітэце Беларусі, абмяркоўваецца праект новай канстытуцыі дзяржавы.

[1] В и т т е С. Ю. По поводу непреложных законов государственной жизни. Спб., 1914. С. 179.
[2] Н а в і н а А. // Наша Ніва. Зборнік. Вільня, 1920. С. 4.
[3] Т у р у к Ф. Белорусское движение. М., 1921. С. 83.
[4] І г н а т о ў с к і У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX стагоддзя. Мн., 1925. С. 217.
[5] Ю х о Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992. С. 264.
[6] С т а н к е в і ч А д. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення. Вільня, 1935. С. 80.
[7] Гл.: Н а в і н а А. Указ. работа. С. 8.
[8] Там жа.
[9] Гл.: Т у р у к Ф. Указ. работа. С. 22.
[10] С т а н к е в і ч А д. Указ. работа. С. 81.
[11] Ж ы л у н о в і ч З. // Полымя. 1927. № 2. С. 186.
[12] Гоман. 1916. № 58. 15 жніўня.

А. М. БАЙЛУКОВА

## ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ Ў ПАЧАТКУ XX ст. НА БЕЛАРУСІ

Гісторыя грамадскіх арганізацый беларускай інтэлігенцыі бярэ свой пачатак у другой палове XIX ст., калі ва ўсіх губернях Беларусі ўзніклі медыцынскія таварыствы. У 1862 г. былі створаны медыцынскія таварыствы ўрачоў у Магілёве і Мінску, распачата хадайніцтва аб заснаванні аналагічнай арганізацыі ў Гродна. Аднак зацвярджэнне статутаў часцей за ўсё зацягвалася на многія гады як з-за звычайнага бюракратызму, так і з-за падазронасці паліцэйскага апарату да праяўлення грамадскай актыўнасці. Толькі праз пяць гадоў (у 1867) быў зацверджаны статут таварыства мінскіх урачоў, праз сем гадоў (1869) — гродзенскіх, а віцебскай арганізацыі для гэтага спатрэбілася дзевяць гадоў. У канцы XIX ст. медыцынскія таварыствы пачалі стварацца не толькі ў губернскіх цэнтрах, але і ў павятовых гарадах. У 1899 г. узнікла таварыства гомельскіх урачоў, у 1902 г. — падобныя арганізацыі ў Бабруйску і Брэсце.

Дзейнасць гэтых таварystваў была даволі разнастайнай. Займаючыся пытаннямі навуковай і грамадскай медыцыны, аб'яднанні ўрачоў не заставаліся абыякавымі да палітычнага жыцця. Так, таварыства мінскіх урачоў у 1898 г. выступіла з патрабаваннем адмены цялесных пакаранняў, а пачынаючы з 1904 г., не было ніводнага пасяджэння, на якім члены таварыства не выяўлялі б свайго абурэння супраць самавольства і насілля, панаваўшых тады ў Расіі[1].

У 80—90-х гг. XX ст. пачынаецца актыўны працэс аб'яднання асобных

калектываў аматараў мастацтва ў культурна-асветніцкія арганізацыі. У розных гарадах Беларусі дзейнічалі музычныя, літаратурна-драматычныя, мастацкія і іншыя таварыствы, якія аб'ядноўвалі прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Да 1898 г. адносіцца афармленне аднаго з самых вядомых — мінскага Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, якое ўжо праз год налічвала больш за 400 членаў: настаўнікаў, юрыстаў, урачоў, журналістаў[2]. Уключыўшы ў сферу сваіх інтарэсаў жывапіс, пластыку, архітэктуру, паэзію, драматургію, таварыства мела намер садзейнічаць аб'яднанню мастацкай інтэлігенцыі, развіццю і распаўсюджванню розных відаў мастацтваў у Мінску[3]. Праца культурна-асветніцкіх арганізацый садзейнічала выхаванню пачуцця нацыянальнай годнасці, павагі да сваёй культуры, далучала да культурных каштоўнасцей іншых народаў.

На рубяжы XIX—XX стст. на Беларусі пачынаюць узнікаць эканамічныя арганізацыі інтэлігенцыі. Першай формай прафесійнага руху былі таварыствы ўзаемадапамогі. Праўда, іх сетка была даволі невялікай і ахоплівала далёка не ўсю інтэлігенцыю. Найбольш распаўсюджаны яны былі сярод настаўнікаў, а таксама служачых гандлёвых і прыватных устаноў.

Адным з першых (у 1897 г.) узнікла таварыства настаўнікаў Віцебскай губерні. 25 жніўня 1900 г. быў зацверджаны статут магілёўскага таварыства. Настаўніцкія арганізацыі падобнага тыпу ў 1901 г. утварыліся ў Мінску і Гродна. Названыя таварыствы аб'ядноўвалі ў сваіх радах настаўнікаў гарадскіх і вясковых народных вучылішч, іх дзейнасць строга рэгламентавалася цэнтральнымі і мясцовымі ўладамі.

Асноўнай функцыяй настаўніцкіх арганізацый было выдзяленне матэрыяльнай дапамогі і пазык сваім членам. Аналіз дзейнасці віцебскага таварыства за дзесяць гадоў паказвае, што сур'ёзна палепшыць матэрыяльнае становішча настаўнікаў яно не магло. Праўленне разгледзела 370, а задаволіла 260 хадайніцтваў аб дапамогах, сярэдні памер якіх склаў каля 30 рублёў. Практычныя вынікі працы пазыковай касы былі яшчэ менш значнымі. За перыяд 1903—1907 гг. ёю мелі магчымасць скарыстацца 37 чалавек[4].

Важнай старонкай дзейнасці таварыстваў настаўнікаў з'яўлялася дапамога ў выхаванні дзяцей. Яна выяўлялася ва ўладкаванні інтэрнатаў для дзяцей настаўнікаў, якія вучыліся ў сярэдніх і пачатковых вучэбных установах, у выдзяленні стыпендый. Аднак у адкрытым у жніўні 1905 г. у Мінску інтэрнаце знайшлі сабе прыстанішча ўсяго чатыры навучэнцы, у 1906 — 10, у 1907 — 13[5]. Акрамя таго, практыкаваліся і іншыя віды дапамогі членам таварыстваў: скідка пры набыцці лекаў, кніг, неабходных тавараў, аказанне бясплатнай медыцынскай дапамогі, забеспячэнне ільготнымі білетамі на транспарт.

Не перабольшваючы магчымасцей настаўніцкіх арганізацый, можна сцвярджаць, што таварыствы ўзаемадапамогі настаўнікаў былі першай формай прафесійнага руху самага шматлікага атрада інтэлігенцыі. Значнасць гэтых арганізацый была і ў тым, што, звязаныя з грамадска-педагагічным рухам на Беларусі, яны прыцягвалі ўвагу грамадскасці да пытанняў народнай адукацыі, прапагандавалі педагагічныя веды, крытыкавалі існуючую сістэму адукацыі.

Моцны ўплыў на настаўнікаў Беларусі аказала рэвалюцыя 1905—1907 гг., калі ў іх асяроддзі было зроблена некалькі спроб прафесійнага аб'яднання. На студзень 1905 г. планаваліся з'езды настаўнікаў у Слуцкім павеце і Гродзенскай губерні. Пазней, 19 кастрычніка гэтага ж года на мітынгу народных настаўнікаў Магілёўскай губерні было прынята рашэнне аб неабходнасці іх аб'яднання. Аналагічнае меркаванне выказалі настаўнікі Віцебскай губерні на сходзе ў маі 1906 г. У ліпені таго ж года ў вёсцы Мікалаеўшчына Мінскага павета адбыўся шырока вядомы з'езд настаўнікаў, на якім прысутнічала 19 прадстаўнікоў з Мінскай, Віленскай і Ковенскай губерняў. Гэтая група настаўнікаў прыняла рашэнне далучыцца да Усерасійскага саюза і кіравацца яго праграмай. Найбліжэйшай мэтай ставілася звяржэнне існуючага рэжыму, што было зафіксавана ў прынятых адозвах: «Таварышы настаўнікі» і «Зямля і воля»[6].

Імкненне да стварэння сваёй прафесійнай арганізацыі ажыццявілася ў маі 1907 г. у Вільні, дзе на з'ездзе народных настаўнікаў быў заснаваны «Беларускі настаўніцкі саюз», які ставіў сваёй мэтай «перабудову справы народнай адукацыі на шырокіх свабодных дэмакратычных пачатках»[7].

Найбольшую актыўнасць і згуртаванасць у рэвалюцыйных падзеях на Беларусі паказалі чыгуначнікі, якія стварылі свае першыя арганізацыі. Характэрнай асаблівасцю быў удзел у іх розных сацыяльных груп: працоўных, служачых, інтэлігенцыі, прадстаўнікі якой адыгрывалі кіруючую ролю ў справе стварэння мясцовых аддзяленняў Усерасійскага чыгуначнага саюза. На адбыўшымся 9 верасня 1905 г. першым з'ездзе чыгуначных служачых быў абраны Часовы мінскі камітэт, у склад якога ўваходзілі тэхнік дыстанцыі П. Я. Гамзегурдзі, інжынеры М. М. Кузняцоў і П. С. Фармакоўскі, юрысконсульт І. І. Метлін і памочнік

прысяжнага паверанага С. А. Валынскі, бухгалтар П. І. Жабо, начальнік аддзялення службы збораў М. О. Рэверэлі. Адным з арганізатараў і кіраўнікоў аддзялення саюза на станцыі Баранавічы быў інжынер М. І. Лепка[8].

Асноўным напрамкам у дзейнасці камітэтаў чыгуначнага саюза на Беларусі было кіраўніцтва стачачным рухам, які ахапіў чыгункі краю восенню 1905 г. Разглядаючы забастоўку як галоўны сродак барацьбы, чыгуначны саюз выстаўляў патрабаванне «поўнай грамадзянскай свабоды і народнага прадстаўніцтва», ажыццяўленне якога дазволіла б «карэнным чынам палепшыць матэрыяльны і службова-прававы стан чыгуначных служачых», што, адпаведна статуту, з'яўлялася галоўнай мэтай дзейнасці прафесійнага саюза чыгуначнікаў[9].

У гэты ж час узніклі прафесійныя арганізацыі паштова-тэлеграфных служачых, якія таксама мелі справу з неаднародным прафесійным асяроддзем. Восенню 1905 г. стачачны рух ахапіў многія паштова-тэлеграфныя канторы Беларусі. У разгар забастоўкі з 15 лістапада па 6 снежня ў Маскве праходзіў першы з'езд Усерасійскага паштова-тэлеграфнага саюза, у складзе дэлегатаў якога былі прадстаўнікі Мінска і Дзвінска. З'езд займаўся выпрацоўкай прафесійных патрабаванняў, праграмы і статута саюза. Імі кіраваліся і аддзяленні паштова-тэлеграфнага саюза: у кастрычніку было створана абласное бюро ў Мінску, камітэты ў Гомелі, Магілёве, Барысаве[10]. Рэвалюцыйныя абставіны прымусілі гэтыя арганізацыі ўзяць на сябе функцыі камітэтаў забастоўкі працаўнікоў пошты і тэлеграфа.

Такім чынам, у гады рэвалюцыі (1905—1907) узняўся на новую ступень прафесійны рух інтэлігенцыі, якая часцяком выступала разам з іншымі сацыяльнымі групамі. У гэты перыяд большасць арганізацый узнікала явачным парадкам. Толькі 4 сакавіка 1906 г. быў выдадзены першы ў гісторыі Расіі агульны закон аб грамадскіх арганізацыях — «Временные правила об обществах и союзах», якія значна абмяжоўвалі правы арганізацый пэўных прафесійных катэгорый. Таварыствы дзяржаўных служачых не маглі «мець на мэце палітычныя альбо несумяшчальныя з патрабаваннямі службовага абавязку, са службовымі адносінамі і з існуючымі парадкам і ўмовамі службы»[11]. Паколькі большая частка працоўнай інтэлігенцыі (настаўнікі, медыцынскія работнікі, чыгуначныя і паштова-тэлеграфныя служачыя, служачыя дзяржаўнага апарату) знаходзілася на дзяржаўнай службе, то, такім чынам, яна не магла ствараць сваіх прафесійных арганізацый.

Сярод нязначнай колькасці зарэгістраваных прафесійных таварыстваў інтэлігенцыі на Беларусі выдзяляліся арганізацыі медыцынскіх работнікаў, якія займаліся прыватнай практыкай ці служылі ў прыватных установах.

У 1906 г. узнікае шэраг зубаўрачэбных і фармацэўтычных таварыстваў. Статуты прафесійных арганізацый зубных урачоў і дантыстаў г. Мінска і Віцебска былі зацверджаны 30 лістапада 1906 г. Сапраўднымі членамі гэтых таварыстваў маглі стаць асобы, якія атрымалі вышэйшую медыцынскую адукацыю. У момант стварэння мінскае таварыства налічвала 27 чалавек, віцебскае — 24[12]. Маючы асноўнай мэтай абарону эканамічных інтарэсаў сваіх членаў, арганізацыі давалі грашовую дапамогу тым, хто цярпеў нястачу, набывалі зубаўрачэбныя інструменты па зніжаным цэнам, аказвалі юрыдычную дапамогу. Аднак гэтым іх дзейнасць не абмяжоўвалася, аб чым сведчыць, напрыклад, паведамленне мінскаму губернатару аб тым, што гарадское зубаўрачэбнае таварыства з самага пачатку яго існавання «нярэдка дапускала на сваіх пасяджэннях не толькі абмеркаванне распараджэнняў урадавых устаноў, але нават і агітацыю супраць такіх»[13].

Магчымасць легалізаваць свае арганізацыі выкарысталі фармацэўты, якія пачалі аб'ядноўвацца яшчэ напярэдадні рэвалюцыі. Адным з першых на Беларусі (1904 г.) узнік мінскі прафесійны саюз. У 1905 г. барацьбу фармацэўтаў у Бабруйску ўзначаліла «карпарацыя аптэкарскіх служачых». Пры арганізацыі свайго саюза ў канцы 1905 г. гомельскія фармацэўты першым пунктам статута прызналі неабходнасць звяржэння самадзяржаўя і склікання Устаноўчага сходу[14].

Да 1905 г. адносіцца спроба стварэння ўсерасійскага аб'яднання служачых аптэк. 15—18 ліпеня ў Маскве праходзіў з'езд фармацэўтаў, дзе прысутнічалі дэлегаты з Мінска, Віцебска, Магілёва. На гэтым з'ездзе абмяркоўвалася становішча служачых аптэк, быў зацверджаны статут Усерасійскага саюза фармацэўтаў, адпаведна якому патрабавалася карэнным чынам змяніць арганізацыю аптэчнай справы, абараняць інтарэсы служачых аптэк, развіваць іх класавую самасвядомасць, арганізуючы забастоўкі[15].

Пасля выхаду закона ад 4 сакавіка 1906 г. фармацэўты змаглі легальна ствараць свае саюзы. У чэрвені 1906 г. афіцыйна пачало дзейнічаць віцебскае таварыства фармацэўтаў, якое ў пачатковы перыяд аб'яднала ў сваіх радах 67 чалавек[16]. 28 ліпеня мясцовыя органы ўрада дазволілі рэгістрацыю Першага

мінскага прафесійнага таварыства фармацэўтаў, якое дзейнічала нелегальна з 1904 г. У першы год таварыства налічвала 34 члены і яго легальная дзейнасць ахоплівала шэраг пытанняў, якія былі звязаны з урэгуляваннем непаразуменняў паміж служачымі і ўладальнікамі аптэк, дапамогай членам, якія цярпелі нястачу. Наперакор забароне ўлады цэнтральнае месца ў працы мінскай арганізацыі фармацэўтаў займала кіраўніцтва стачачнай барацьбой. Аб гэтым сведчаць факты ўдзелу таварыства ў забастовачным руху фармацэўтаў Мінска (студзень — люты, лістапад 1905 г), Барысава (красавік 1906), арганізацыя байкотаў супраць незаконнага звальнення служачых. Гэты бок дзейнасці таварыства не мог застацца незаўважаным мясцовай уладай і, прызнаўшы працу мінскай арганізацыі фармацэўтаў «пагражаючай грамадскай бяспецы і спакою», губернская прысутнасць па справах аб таварыствах у ліпені 1908 г. вырашыла забараніць яго[17].

У сакавіку 1907 г. спрабавалі зрабіць сваё аб'яднанне прадстаўнікі тэхнічнай інтэлігенцыі — землямеры. У статуце таварыства землямераў Паўночна-Заходняга краю зазначалася, што мэтай арганізацыі з'яўляецца абарона прафесійных інтарэсаў яе членаў, а таксама забеспячэнне магчымасці ўсім установам і прыватным асобам карыстацца паслугамі вопытных спецыялістаў межавай справы. Аднак улады не дазволілі стварэння гэтай арганізацыі. Двойчы разглядаючы пададзеную заяву, Мінская губернская прысутнасць па справах аб таварыствах адмовіла ў рэгістрацыі арганізацыі. Прычыны нежадання ўлад зацвярджаць падобныя таварыствы дастаткова канкрэтна выказаны віцебскім губернатарам у чэрвені 1909 г., калі на яго імя таксама была пададзена заява ад групы землямераў. У сакрэтным лісце губернатар пісаў, што «непажадана дапушчэнне сходаў, на якіх маглі б абмяркоўвацца і падвяргацца крытыцы як распараджэнні непасрэднага начальства, так і землеўпарадкавальных камісій...»[18].

Тым не менш у складаных грамадска-палітычных умовах пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі існавалі розныя таварыствы, якія аб'ядноўвалі пэўныя катэгорыі інтэлігенцыі. Прычым у разглядаемы перыяд назіраецца рост колькасці добраахвотных арганізацый, у якія ўцягваюцца новыя слаі інтэлігенцыі. Пашырэнне дыяпазону іх дзейнасці тлумачыцца як грамадскім уздымам, так і аб'ектыўнымі патрабаваннямі сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця.

[1] Гл.: П о л я к М. А. // Беларуская мэдычная думка. 1927. № 9-12. С. 106.
[2] Гл.: Минский листок. 1899. 7, 23 февраля.
[3] Гл.: Устав минского Общества любителей изящных искусств. Мн., 1899. С. 3.
[4] Гл.: Отчет Общества взаимного вспомоществования учителям и учительницам народных училищ Витебской губернии за 1907 г. Витебск, 1908. С. 10—11.
[5] Гл.: Отчет о деятельности Общества взаимного вспомоществования учащим и учившим в народных училищах Минской губернии за 1912 г. Мн., 1913. С. 4.
[6] Гл.: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 458, воп. 1, спр. 342, арк. 40—41, 94—95.
[7] Наша Ніва. 1907. 8 (21) ліпеня.
[8] НАРБ. Ф. 295, воп. 1, спр. 7557а, арк. 87—89, 104.
[9] 1905 год в Белоруссии: Сборник статей, воспоминаний и материалов. Мн., 1925. С. 121.
[10] Гл.: Б а з и л е в и ч К. В. Очерки по истории профессионального движения работников связи. М., 1925. С. 427, 184, 214.
[11] Полное собрание законов Российской империи. Спб., 1909. Т. 26, № 27479.
[12] Гл.: НАРБ. Ф. 306, воп. 1, спр. 6, арк. 8; ф. 2649, воп. 1, спр. 37, арк. 25.
[13] Там жа. Ф. 306, воп. 1, спр. 6, арк. 20.
[14] Там жа. Спр. 4, арк. 32; 1905 год у Беларусі: Зб. архіўных дакумэнтаў. Мн., 1926, С. 23.
[15] Гл.: З и л ь б е р г И. Профессиональное движение служащих фармацевтов. М., 1930. С. 31.
[16] НАРБ. Ф. 2649, воп. 1, спр. 2, арк. 3, 32.
[17] Там жа. Ф. 306, воп. 1, спр. 4, арк. 3—35.
[18] Там жа. Ф. 2649, воп. 1, спр. 229, арк. 2.

А. В. ДАВІДОВІЧ

## ПАЛІТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ З. Х. ЖЫЛУНОВІЧА (1917 — пач. 1918 г.)

Цікавасць, што прабудзілася сёння да вывучэння і асэнсавання гісторыі Айчыны, паставіла складаную задачу — вярнуць з небыцця імёны людзей, якія па волі лёсу на крутых пераломах гісторыі не толькі актыўна ўплывалі на ход гістарычнага працэсу, але змаглі захаваць да канца адданасць ідэалам дэмак-